Аддзел культуры
Ваўкавыскага райвыканкама

ВАЎКАВЫСКІ РАЁННЫ МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ І КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЙ РАБОТЫ

# Ваўкавыскія пагулянкі

(Зборнік сцэнарных распрацовак)

Выпуск 1

г. Ваўкавыск
2004г.

## З М Е С Т

Пазнавальна-гульнёвая праграма **“Кола беларускага фальклору”** 3

Сюжэтна-гульнёвая праграма **“Вялікодныя забавы”** 16

Сюжэтна-гульнёвая праграма **“Зялёныя святкі”** 18

Гульнёвая праграма **“Пашлі, Божа, многа збожжа!”** 22

Сюжэтна-гульнёвая праграма **“Авангардызм – 2000”** 26

Сюжэтна-гульнёвая праграма
**“Працавітая Марылька запрашае ўсіх гаспадынькаў”** 35

## *КОЛА БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ*
## пазнавальна-гульнёвая праграма

*Сцэна па-святочнаму ўпрыгожана: на сцэне стаіць стол, засцелены абрусам. На стале розныя абрадавыя стравы: пірагі, бліны, яблыкі. Заднік сцэны ўпрыгожаны бутафорскім колам і эмблемай "Кола беларускага фальклору".*

**Вядучыя:** Бабка Фальклорыха, Кацярынка, Мацейка.

*(На сцэну выходзіць Кацярынка з талеркай бліноў, якую старанна ставіць на стол, за ёй выбягае Мацейка.)*

**Мацейка:** Чаго гэта ты ўсё круцішся каля стала?

**Кацярынка:** Я не кручуся, а папраўляю, зараз госці да нас прыйдуць.

**Мацейка:** А давай і я папраўлю, бачыш тут адзін блін вельмі дрэнна ляжыць, давай я яго з'ем, каб не псаваў від? (*працяўвае руку да бліна).*

**Кацярынка:** (*б'е па руцэ*) Усё добра тут ляжыць! Ідзі вунь лепш гасцей у хату запрашай.

**Мацейка:** Дык, што іх яшчэ не запраілі?

**Кацярынка:** Запрасілі, ды не ўсіх. Вазьмі запрашэнні, якія ляжаць на стале, і хуценька, таму што бабуля зараз прыйдзе.

**Мацейка:** А што гэта за кола на запрашэннях намалёвана, га? Кацярынка?

**Кацярынка:** Усё потым Бабка Фальклорыха раскажа, а ты паспяшайся!

**Мацейка:** Ну потым, дык потым. Добра, пайду запрашаць, а ты глядзі, каб у хаце парадак быў!

(*Мацека ідзе ў залу і раздае жэтоны-запрашэнні, на якіх намалівана драўлянае кола).*

**Кацярынка:** Ну, вось, і пайшоў. А я пакуль прыбяруся.

(*Гучыць беларуская полька, Кацярыека прытанцоўваючы прыбіраў хаце.)*
*(Мацека з гасцямі заходзіць у хату.)*

**Мацейка:** А вось і мы прыйшлі. Заходзьце, заходзьце...

*(Разам з Мацекінымі гасцямі заходзяць і госці, запрошаныя Бабкай Фальклорыхай.)*

**Госці** : Добры дзень у вашу хату!
**Кацярынка:** Добры дзень, праходзьце, сядайце.

**Мацейка:** Ой, як весела, колькі да нас гасцей прыйшло!

**Кацярынка:** Мацейка, ідзі пакліч Бабку Фальклорыху.

**Мацейка:** Ізноў я...

**Кацярынка:** Ізноў ты, і хутка!

**Мацейка:** (крычыць.) Бабка Фальклорыха! Ідзі хутчэй госці ўжо сабраліся, тваіх цікавых казак зачакаліся...

**Кацярынка:** Табе не сорамна перад чужымі людзьмі горла драць?

**Мацейка:** Ты ж сама мне толькі, што сказала, паклікаць бабулю, вось я яе і клічу.

*(Выходзіць Бабка Фальклорыха)*

**Бабка Ф.:** Іду, іду... Я тут яшчэ некалькі страў прыгатавала. *(Ставіць талерку з пісанкамі на стол).* Добры дзень госцікі даражэнькія. Прабачце, што затрымалася. Усё хацела паспець, ды ўсё ж такі не паспела.

**Госць 2:** Хопіць, нічога не трэба. Мы проста прыйшлі паслухаць вашы цікавыя расказы аб нашых продках!

**Госць 1:** І праўда, што гэта вы тут наставілі. Свята, здаецца, сёння няма. Нам Мацека казаў, што будзем проста слухаць пра нейкае кола беларускага фальклору.

**Бабка Ф.:** Ну, па-першае, калі ёсць хоць адзін госць, дых і свята ёсць. А па-другое, раз у нас многа гасцей, значыць і свят сёння будзе шмат. А цікавую гісторыю нашых продкаў я вам зараз паведамлю.

**Мацейка:** Бабуля, а вось на гэтым коле можна павазіцца?

**Бабка Ф.:** Не спяшайся, унучак, зараз мы на гэтым коле ўсе разам паедзем

**Мацейка:** Усе, на адным?

**Кацярынка:** Мацейка, не перабівай бабулю!

**Бака Ф.:** Нічога, хай пытае. А кола гэтае не простае, гэта кола фальклору. На ім можна аб'ехаць шмат свят, што мы з вамі сёння і зробім. Але спачатку хачу запытаць, ці ведаеце вы, што такое фальклор? І які ён бывае?

**Кац- ка:** Я ведаю, фальклор - гэта народная мудрасць, а бывае ён самы розны.., ну, напрыклад, песенны, ці...

**Мацейка:** Гульнёвы! Ці.., ну, падкажыце, госцікі!

(*Госці называюць віды фальклору.*)

**Бабка Ф.:** Добра ведаеце, малайцы, але пра самы featured рознабаковы вы запамятавалі. Ёсць яшчэ і святочна-абрадавы фальклор. Гэты від фальклору змяшчае ў сабе многа іншых. У тым ліку і песенны, і музычны, і танцавльны, і празаічны і многія іншыя. Сёння, мы з вамі, даведаемся пра цэлае кола беларускіх свят і традыцый.

**Мацейка:** Вось як цікава, але пры чым тут кола не разумею?

**Бабка Ф.:** Зараз табе ўсе стане зразумела, а пакуль трэба чынна прыняць гасцей. У нас на Беларусі існуе добры звычай - вітаць гасцей хлебам-соллю, які падаюць на ручніку.

*(Дзеці выносяць гасцям хлеб з соллю на ручніку.)*

Ручнік - гэта сімвал чысціні і цяпла. Хлеб - сімвал дабрабыту, а на кошт солі існуе ў народзе пагаворка: "Каб лепш пазнаць адзін другога, трэба пуд солі з'есці". Вось таму соль і прысутнічае каля хлеба з ручнікам.

**Мацейка:** Бабуля, а адкуль ты ўсё ведаеш?

**Бабка Ф.:** Пражывеш столькі гадоў, колькі я і ты будзеш ведаць. А вы, даражэнькія госцікі, не саромейцеся, частуйцеся. А я, зараз вам раскажу аб святах, якія былі даўней у нашых мясцінах. Толькі давайце дамовімся, вы мне

таксама будзеце дапамагаць. Можа хто ведае, якія наогул святы?

**Мацейка:** Беларускія святы?

**Бабка Ф.:** Беларускія.

(*Госці называюць святы.*)

**Мацейка:** І я ведаю адно - гэта Калядкі.

**Бабка Ф.:** Вельмі добра, а хто ведае якое яшчэ свята прыпадае на гэты ж час?

**Кацярынка:** Ражство Хрыстова!

**Бабка Ф.:** Правільна. Толькі Каляды гэта язычніцкае свята, а Ражство Хрыстова - хрысціянскае. На Каляды ў кожнай хаце рабілі святую вячэру, на якой абавязковымі стравамі былі куцця і бліны. Калядоўшчыкі хадзілі па хатах і спяпалі калядныя песні.

**Кацярынка:** Я ведаю адну калядную песню пра казу. Зараз мы ўсе разам яе паспяваем, хто зусім не ведае слоў, падыміце руку?

*(Хто першы падымае руку з гасцей, той атрымлівае ад Кацярынкі кажушок "козачкі*")

Ну вось "Козачка" у нас ёсць, а астатнія будуць падпяваць. Вам паважаны госць, патрэбна проста выконваць дзеянні, аб якіх спяваецца ў песні. Усё зразумела? (*Адказы гасцей.)*

*(Праходзіць інсцэніроўка песні "Каза")*

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэрая,
Паварочвайся, не забывайся.
То на ножанькі, то на рожанькі,
То на капыцікі залаценькія.
Пакланіся зграбна,
Павярніся складна,
Кажы, дзе хадзіла,
Дзе ты што рабіла.
Каза мая ўчона,
Кіем ахрышчона,
Прайшла ўсе навукі,
Знае розны штукі. Го!
Дзе каза паходзіць,
Там жыта зародзіць,
А дзе пагайсае,
Там павылягае.
Дзе каза бывае,
Там шчасце вітае,
А дзе не бывае,
Там яно мінае.
Ну, каза, сагніся,
Усім пакланіся,
Да саменькіх ножак,
Каб нам быў пірожак.
Ну, закладай рогі
Ды падбірай ногі,
З хаты выхадзі,
Бяду вывадзі.

**Бабка Ф.:** Малайцы, вельмі добра спявалі, а "Козачка" танцавала проста цудоўна! Вось табе за твой танец смачны пернік. *(Частуе госця, які выконваў ролю "Казы")*. А зараз мы паглядзім, якія вы ведаеце калядныя прыказкі.

**Мацейка:** Падышлі Калядкі, бліны ды аладкі.

**Кацярынка:** Калі Калядкі, рабі сам і парадкі.

**Госць 1:** Калядкі - добрыя сняткі: наеўся, напіўся, дый на палаткі.

**Госць 2**: Хто перад калядамі жывёлу добра даглядае, той перад Вялікаднём за хвост не падымае.

**Бабка Ф.:** Ой, колькі вы ўсяго ведаеце. Малайцы! А хто ведае, якое свята ідзе за Калядамі?

**Госць 3 :** Вадохрышча.

**Бабка Ф.:** Так, Вадохрышча - гэта хрысціянскае свята. Яно адзначаецца штогод 6 студзеня ў католікаў і 19 студзеня ў праваслаўных вернікаў. Гэтае свята адзначаецца ў памяць аб тым дні, калі Ісус Хрыстос быў ахрышчаны Іванам Прадсечам у рацэ Іардан. А хто ведае, якія прыкметы існуюць у гэты дзень аб надвор'і? *(Жадаючыя адказваюць.)*

**Госць 4:** Калі на Вадохрышча мароз і сонца - чакай засушлівага лета.

**Госць 5:** А калі на Вадохрышча дзень цёплы - будзе хлеб цемны.

*(Бабка Фальклорыха адказаўшых частуе пернікамі.)*

**Бабка Ф.:** І гэта вы ведаеце. Ну тады наша кола пакацілася далей. Масленіца - гэтае свята не мае канкрэтнай даты, яно пачынаецца за тры тыдні да Вялікадня.

**Кацярынка:** Святкавалі Масленіцу шумна і весела. А хто ведае, дзе праводзіліся гульні і забавы на Масленіцу?

**Госць 6:** На вуліцы і горка.

**Госць 7:** На беразе рэчкі.

**Госць 8:** За вёскай.

**Бабка Ф.:** А якое ідзе свята за Масленіцай?

**Кацярынка:** Якое? Я не ведаю.

**Мацейка:** Я ведаю! Гэта – "Гуканне вясны".

**Бабка Ф.:** Так, пачатак палявых работ, час веснавых усходаў, выпасу жывёлы на пашу, прылёту птушак. На Гуканне вясны дзяўчаты вадзілі карагоды, спявалі

песні, заклікалі вясну. Нешта мы з вамі таксама засядзеліся, давйце паводзім карагоды і пагукаем вясну, вось так: ГУ... ГУ...

*(Госці паўтараюць. Затым усе становяцца ў карагод і пад мелодыю песні "Жаваронанчкі прыляціце" усе зазываюць вясну і водзяць карагоды.)*

Радаваліся вясне людзі, моладзь гульні заводзіла, танцавала.

**Кацярынка:** Бабуля, а давай і мы трошкі пагуляем і патанцуем.

**Бабка Ф.:** Я не супраць, танцуйце сабе, а я буду назіраць за вамі, і хто будзе добра танцаваць, той атрымае мой смачны пернік.

**Кацярынка:** Гарманіст, гарманіст
Зайграй польку весялей.
Нашых ножак не жалей,

**Мацейка:** Нашы ножкі не баляць,
Яны хочуць танцаваць,
Каб той пернік атрымаць!

*(Усе жадаючыя танцуюць польку беларускую, лепшых танцораў Бабка Фальклорыха частуе смачнымі пернікамі.)*

**Бабка Ф.:** Трошкі адпачніце, а я буду далей вам расказваць. Вясной людзі спяшаліся засеяць поле, пасадзіць агародніну, таму працы было многа і праца была не лёгкай.

**Мацейка:** Ая ведаю загадкі пра агародніну.

**Бабка Ф.:** Ну дык давай загадвай.

**Мацейка:** А той хто адгадае, салодкі прыз атрымае, не не пернік, я такіх пякчы не ўмею, затое вось такія лядыжкі рабіць навучыўся, смачныя... *(Паказвае цукерку на палачцы.)*

1. Хто забачыць, той заплачыць. (цыбуля)
2. Чырвоныя цвіклі ў зямлі паніклі. (буракі)

Трымайце пачастункі за адказы, як кажуць свайго вырабу...

**Кацярынка:** І калі гэта ты паспеў?
**Мацейка:** Вось табе яшчэ скажы...

**Бабка Ф.:** Ну, хопіць ужо, Кацярынка, будзе час і ты цукерак наробіш, а то кола наша ад вашых сварак астанавілася, можа і сапраўды ўжо хопіць расказваць? (*Дзеці адказваюць*.)

**Кацярынка:** Не, не, расказвайце далей, бабуля...

**Бабка Ф.:** Ну, тады слухайце. У цыкле веснавых свят ёсць і такі прысвятак - Саракі, ён прыпадае на дні веснавога раўнадзенства.

**Кацярынка:** А калі яно адзначаецца?

**Бабка Ф.:** Адзначаецца яно 22 сакавіка, калі дзень станавіўся роўны ночы. А за Саракамі надыходзіць цудоўнае свята Вялікдзень.

**Мацейка:** А я ведаю, што на Вялікдзень валачобнікі абыходзілі з песнямі ўсе двары.

**Бабка Ф.:** Так, а па заканчэнні песні гаспадары частавалі валачобнікаў пісанкамі, гарэлкай, пірагамі, іншай стравай. У нас таксама ёсць фарбаваныя яйкі-пісанкі якімі зараз Кацярынка вас пачастуе.

(*Кацярынка частуе гасцей пісанкамі чырвонага і жоўтага колеру.)*

Хто атрымаў чырвоныя - станавіцеся па правы бок, у каманду Кацярынкі, а хто атрымаў жоўтыя - станавіцеся па левы бок, у каманду Мацейкі.

*(Праводзіцца гульня "Перакаці яечка". На крэслах стаяць талеркі, і па камандзе патрэбна кожнаму ўдзельніку сваёй каманды, перакаціць свае яечка вакол талеркі, без дапамогі рук, а потым сесці за стол. Чыя каманда хутчэй усядзецца за стол тая і пераможца.)*

**Бабка Ф.:** Малайцы, добра справіліся, частуйцеся калі ласка. *(Частуе цукеркамі пераможцаў.)*
Ну, а каманда якой сёння трошкі не пашанцавала, зможа яшчэ праявіць свае здольнасці ў цікавай гульні "У біткі"

*(Праводзіцца гульня "У біткі". Удзельнікі раздзяляюцца па парах і б'юцца пісанкамі, чыё яйка мацнейшае, той і пераможца. Пераможцаў частуюць салодкімі прызамі.)*

**Бабка Ф.:** Трошкі пагулялі, а зараз адпачніце, наша кола пакацілася далей. За Вялікдзенем надыходзіць Радуніца.

**Мацейка:** А за Радуніцай – Юр'е.

**Госць і:** За Юр'ем - Мікола.

**Бабка Ф.:** Вось як хутка наша кола пакацілася...

**Кацярынка:** За Міколай - Троіца. А вось калі адзначаецца гэтае свята я не ведаю.

**Бабка Ф.:** Троіца адзначаецца на пяцідзесяты дзень пасля Вялікдзеня. А хто ведае як яшчэ называецца гэтае свята?
(*Госці адказваюць.*) Правільна, Сёмуха. А наступнае якое свята надыходзіць?

**Кацярынка:** Я ведаю, ведаю! Гэта - Купалле. Яно адзначаецца з 6 на 7 ліпеня.

**Бабка Ф.:** Малайчына, Кацярынка, а хто ведае як адзначалі гэтае свята?

**Госць і:** На Купалле распальвалі вогнішча, дзяўчаты завівалі вяночкі, вадзілі вакол агню карагоды, спявалі купальскія песні.

**Госць 2:** А я ведаю адну купальскую песню, вы яе таксама павінны ведаць - гэта "Купалінка". Давайце і мы паспяваем!

(*Усе спяваюць песню "Купалінка"*.)

Купалінка,Купалінка,
Цёмная ночка,
Цёмная ночка,
Дзе ж твая дочка?

Мая дочка ў садачку
Ружу, ружу поліць,
Ружу, ружу поліць
Белы ручкі коліць.

Кветачкі рвець, кветачкі рвець,

Вяночкі звівае,
Вночкі звівае,
Слёзкі пралівае.

**Кацярынка:** Ой, колькі ў нас розных свят!

**Бабка Ф.:** І гэта яшчэ не ўсе. Наша кола знаходзіцца яшчэ ў падарожжы, бо за "Купаллем" ёсць яшчэ многа свят, напрыклад: Пятро, Ілля, Зажынкі, Дажынкі. А за Дажынкамі і Спас хутка пачынаецца. Ён складаецца з трох частак, можа хто ведае як яны называюцца? (*Госці адказваюць.)*

**Госць 1:** Першы - мядовы або макавы. Другі - яблычны.

**Госць 2:** А трэці - хлебны, арэхавы Спас.

**Бабка Ф.:** Так, так, малайцы. А якія вы ведаеце гатункі яблыкаў? *(Госці адказваюць.*) Ну, а зараз можа трошкі пагуляем з яблыкамі?

**Мацейка:** Пагуляем! Пагуляем!

*(Праводзіцца гульня "Яблычная музыкальная". Удзельнікі становяцца ў круг і пад гукі беларускай полькі, без дапамогі рук перадаюць яблыкі. Калі сціхне музыка, той у каго застаўся яблык выходзіць з гулькі. Пераможца той, хто застанецца апошні ў кругу.)*

**Кацярынка:** Бабуля а, якое свята надыходзіць за Спасам?

**Баб-ка Ф.:** За Спасам - Багач - свята ўраджаю. А за Багачом - Уздвіджанне, а за ўздвіджаннем свята Пакроў... На свята Пакроў заканчваюцца ўсе палявыя работы і зямля пакрываецца снегам.

**Мацейка:** А, што было далей, бабуля?

**Бабка Ф.:** А далей былі маразы і завеі - пачыналася Піліпаўка. У гэты час усе павінны прытрымлівацца перадкалядных пастоў.

**Мацейка:** Бабуля, а як гэта атрымалася, што мы ізноў вярнуліся да Каляд?

**Бабка Ф.:** Так і павінна было атрымацца, бо ўсе нашы святы знаходзяцца ў адным коле, якое ўвесь час падарожічае па Беларусі.

*(Госці глядзяць на гадзіннік.)*

**Госць і:** Ой і засядзеліся мы нешта.

**Госць2:** Да хаты ужо даўно пара, вы так цікава ўсё расказвалі, што мы і не заўважылі як час праляцеў.

**Госць3:** Дзякуй вялікі, вам Бабка Фальклорыха, што паведамілі нам сёння многа цікавага.

**Бабка Ф.:** Дзякуй і вам госцікі, што завіталі да нас. Мне здаецца, што сёння атрымалася цудоўнае падарожжа?
(*Госці адказваюць.)*
Усім вам жадаю добрай долі і бяды ніколі!

**Кацярынка:** Хай абміне вас бяда і нянасце...

**Мацейка:** А сонечным ранкам да вас прыйдзе шчасце!

**Бабка Ф.:** Да пабачэння, госцікі дарагія!

Сцэнарый распрацавала
метадыст РМЦ Лупінская Жанна.

## Сюжэтна-гульнёвая праграма
## “ВЯЛІКОДНЫЯ ЗАБАВЫ”

Вяд: Добры дзень, паважаныя! Ой, колькі прыгожых святаў ёсць у беларусаў. І вы, напэўна, ведаеце і святкуеце іх. Я упэунена, што свята вялікдзень ведаюць усе. Зараз на вуліцы холадна, але мы у сэрцы усе чакаем гэтае свята. Да гэтага свята мы доўга рыхтуемся і шмат гатуем прысмакаў. І зараз мы з вамі ўспомнім, што павінна абавязкова быць стале ў гэты святочны дзень?

*(Гледачы адказваюць)*

Вяд: Так, правільна яйкі. А яшчэ акрамя яек, ад якой стравы і прысмакаў аж трашчаць сталы на вялікдзень?

*(Удзельнікі пералічваюць стравы, хто адказвае той атрымлівае жэтон.)*

Вяд. Хто атрымаў жэтон. Калі ласка выходце да нас на пляцоўку. У каго на жэтоне намаляваны пірог, той і будзе ўдзельнікам команды “пірог”, а ў каго яечка, той будзе ўдзельнікам каманды “ яечка”. Вось і атрымалася у нас дзве каманды: “пірог і яечка” і зараз мы звамі трошкі пагуляем.

(*Праводзіцца гульня “Перакаці яечка”. Насупраць кожнай каманды на крэсле стаіць талерка, каля талеркі ляжыць вялікоднае яечка. Па камандзе вядучага кожны удзельнік па чарзе павінен перакаціць яечка вакол талеркі. Без дапамогі рук. Якая каманда хутчэй перакоціць яечка, тая і пераможца.)*

Вяд: Дзякуй вялікі камандзе “-“, калі ласка праходце на сваё месцы. А з вамі каманда “-“ мы яшчэ пагуляем, а лепш сказаць паглядзім на колькі развіта ваша 7 пачуццё.

(*Праводзіцца гульня "У які бок"; на крэсле пад талеркай ляжыць яечка,удзельнікам гульні трэба пакласці саломінку ў той бок, у які накіравана само яечка.)*

Вяд.: Дзякуй вам за ўдзел у гульні. А яшчэ ў мяне да вас невялічкая справа,

Праводзіцца гульня "Чыё мацнейшае яйка".

(*Удзельнікі павінны стукацца яечкамі, чыё яечка мацнейшае, той і пераможца.)*

Вяд.: Дзякуй за ўдзел і прайдзіце на сваё месца. Ну, а з вамі, пераможцамі, мы яшчэ пазнаёмімся. Як ваша імя? *(Адказвае пераможца.)* Бачу, што на нашым свяце "___" вы былі самым здольным, з чым мы вас і віншуем, і за што мы вас і частуем. (*Пераможцу віншуюць велікоднымі прысмакамі.)* Паважаная "__", можа вы пажадаеце што-неюудзь прысутным у нашай зале, звязанае са святам Вялікдзень? (*Пажаданне пераможцы.)*

Вяд.: Дзякуй усім за ўвагу і ўдзел у нашай праграме. Дапабачэння!

Усім вам "ХРЫСТОС УВАСКРЭС".

Сцэнарый распрацавала метадыст РМЦ
Жанна Лупінская
**2002 год**

## ЗЯЛЁНЫЯ СВЯТКІ

сюжэтна-гульнёвая праграма

*Сцэна ўвасабляе сабой паляну,якая вакол упрыгожана галінкамі бярозы.Гучыць беларуская мелодыя.На фоне музыкі словы дыктара.*

**ДЫКТАР:** Пойдзем, дзевачкі, мы ў гай гуляць,
Мы ў гай гуляць, вянкі завіваць.
А заўём вянкі, ды на ўсе святкі.
Ды на ўсе святкі на Духоўскія.

*Гучыць фанаграма песні "Ой, ты Троіца". Выходзіць вядучая ў нацыянальным касцюме з вянком на галаве.*

**ВЯДУЧАЯ:** Ой, Троіца, Троіца, багародзіца,
Пасеем лён, ды няхай зародзіцца.

Вось так і на Беларусі пачыналася адно з прыгажэйшых святаў Сёмухі, альбо троіцы, якое адзначаецца на сёмы тыдзень пасля Вялікадня. Менавіта гэтае свята лічыцца дзявоцкім, таму што дзяўчына сімвалізуе маладосць і прыгажосць прыроды. І ў гонар гэтага свята мы вас адорваем галінкамі бярозы.

*Памочніца раздае галінкамі дрэў дзяўчатам..*

**ВЯДУЧАЯ:** У сёмушны дзень дзяўчаты збіраліся ў гурты, спявалі песні, вадзілі карагоды, вілі вяночкі і варажылі на лёс. І зараз мы таксама паводзім карагоды з тымі дзяўчатамі, якія атрымалі галінкі бярозы. Калі ласка, станьце ў карагод.

*Гучыць фанаграма песні "Ой, ты Троіца". Дзяўчаты водзяць карагоды. Усе ўдзельніцы застаюцца ў карагодзе.*

**ВЯДУЧАЯ:** Саўю вяночак на долю дзявочу,
На сваё каханне, на любага спатканне.
Бяроза зялёненька вянок мне даравала,

Вянок мне даравала, каб я любага спаткала.

І зараз вы самі паспрабуеце сплесці агульны вянок з гэтых галінак бярозы, якія вы трымаеце ў руках. Кожны павінен уплесці ў вяночак сваю галінку пакуль гучыць музыка, а хто не паспее, калі музыка скончыцца, дык тая дзяўчына ўсім прысутным штосьці пажадае і з карагода выбывае шукаць свайго суджанага-ражанага. А пачнём з таго, у каго галінка з кветачкай. Тая перадае наступнай...і так далей, а хто з карагода выбывае, сваю галінку з вяночкам наступнаму ўручае. Вось так.

*Вядучая з памочніцай паказвае, як правільна трэба плясці агульны вянок.*

**ВЯДУЧАЯ:** Ітак, пачалі...

*Праводзіцца гульня **"Агульны вянок"**. Гульня спыняецца, калі ў карагодзе застаецца чатыры ўдзельніцы.*

**ВЯДУЧАЯ:** Ну, ужо хопіць кавалераў шукаць. Надыйшоў час і пазнаёміцца з самымі працавітымі дзяўчынкамі. Калі ласка, дзяўчынкі-прыгажунькі, назавіце сваё імя. *(Дзяўчаты знаёмяцца з гледачамі.)* Ну вось мы і пазнаёміліся, а цяпер можна і на лёс паваражыць. Загадайце сабе пажаданне і зараз кожная з вас зможа даведацца ці збудзецца яно ў гэтым годзе. Раней кідалі вяночкі на дрэва, а мы з вамі будзем кідаць вяночкі, якія вы сплялі, праз галінку, якая ляжыць на пляцоўцы. Але пры гэтым дзеянні вы павернецеся спіной да галінкі, якая ляжыць на пляцоўцы і будзеце перакідаць вяночак паверх галавы. Калі вы перакідаеце гэтую галінку, дык значыць ваша мара здзейсніцца ў гэтым годзе.

*Праводзіцца варажба пад гукі беларускай мелодыі.*

**ВЯДУЧАЯ:** Зяляніны юнай свята, свята лесу і вады,
І бярозкі, як дзяўчаты святкаваць сюды прыйшлі.

Дзяўчаты, а хто не перакінуў вяночак праз галінку бярозы, не сумуйце, у вас яшчэ ўсё жыццё наперадзе і вашы пажаданні

абавязкова збудуцца. А зараз у вас ёсць магчымасць прыняць у наступнай нашай гульні.

Усе вы ведаеце, што Сёмуха – гэта свята абуджэння прыроды. У народзе яго назыфваюць “Зялёныя святкі” менавіта таму, што ўсе расліны ў гэты час прырода фарбуе ў зялёны колер. І зараз вам патрэбна кожнай па чарзе назваць расліны, якія вы ведаеце, Гэта могуць быць кветкі, дрэвы, кусты і г.д. І калі вы назавёце раслін больш за сем, дык вашы пажаданні абавязкова збудуцца, бо сёння ў нас Сёмуха.

*Праводзіцца гульня “**Багацце прыроды**”.*

**ВЯДУЧАЯ:** Дзякуй вялікі за ўдзел у нашай гульні. Цяпер вашы мары абавязкова збудуцца... А каб незапамятаваць гэтае свята, трымайце ў падарунак бярозавы вяночак.

*Вядучая адорвае ўдзельнікаў вяночкамі, дзяўчаты застаюцца на сваіх месцах.*

**ВЯДУЧАЯ:** Раней на Сёмуху быў абрад “Купавання”. Дзяўчаты бралі вяночкі ў рукі, прасілі адна ў адной прабачэння і цалаваліся праз вяночак. Вось так... *(Вядучая с памочніцай паказваюць,як кумі ліся.)* А ці ёсць у вас, дзяўчаткі, сяброўкі, з якімі вы б зараз пакуміліся? Калі ёсць, дык клічце іх да нас, а калі няма, дык знайдзіце сабе сяброўку сярод прысутных.

*Дзяўчаты шукаюць сяброваk.*

**ВЯДУЧАЯ:** Кажуць. Каля сяброўкі пакуміліся, дык у згодзе будуць жыць увесь год.

*Дзяўчаты с сяброўкамі праводзяць абрад “**кумавання**”.*

**ВЯДУЧАЯ:** Ну вось, мы сёння з вамікарагод вадзілі, вянкі плялі, варажылі, “куміліся”, але яшчэ не спявалі. І таму я зараз вам прапаную разам з сяброўкамі паспяваць прыпеўкі.

*Праводзіцца **конкурс прыпевак**.*

**ВЯДУЧАЯ:** Малайцы, добра спявалі, а зараз давайце ўсе разам, дружна паспяваем, але кожны сваю прыпеўку. Ітак, пачынаем...

*Усе разам спяваюць кожны сваю прыпеўку.*

**ВЯДУЧАЯ:** Дзякуй, вам, шчыры, што не паснулі,
І што гулялі ў нашыя гульні.

Жадаю вам, дзяўчаты,
Каб да вас хутка прыйшлі ў сваты,
Каб цвісці, як кветкі на лузе,
А жыццё няхай салодкім будзе!

Жывіце шчасліва, здаровы бывайце,
І нашу Сёмуху ўспамінайце!

Праграму распрацавала
метадыст Ваўкавыскага РМЦ
**Жанна Лупінская**

## *ПАШЛІ, БОЖА, МНОГА ЗБОЖЖА*
**гульнёвая праграма**

(*Гучыць беларуская песня "А па нашай ніўцы", вядучая ў беларускім народным касцюме "Жнейка" выходзіць на авансцэну.)*

**Дыктар:** Гаварыла поле шырокае, жыта ядронае:
Жнейкі, жнейкі мае маладыя, сярпы залатыя,
Прыходзьце да мяне заўтра рана,
Каб я недажатым не стаяла.

**Жнейка**: Вось і сабралі мы ўвесь ураджай. Стаміліся канешне, але як людзі кажуць "Не радзіцца хлеб без працы". Дзякуй Богу, што надвор’е было цёплае і сухое, дык усё жыта і пшаніцу паспелі прыбраць. Відаць у гэтым годзе многа прысмакаў будзем з мукі пячы! Але пакуль , выпякаць трэба запытацца ў вас,паважаныя, якія мучныя стравы падабаюцца вам больш за ўсё? (адказваюць)

*( Праводзіцца гульня "**Аўкцыён страў**". Адказаўшыя атрымліваюць па жытнёваму каласку і запрашаюцца на пляцоўку.)*

**Жнейка:** Як вядома, усе тыя прысмакі, якія вы вельмі люб1це, не адразу з’яўляюцца на нашых сталах. Для гэтага патрэбна шмат працаваць не толькі ў пякарні, але і на полі, дзе існуе таксама сваё жыццё, паміж каласкоў. А вось, якое яно,тое жыццё, да таго часу пакуль жыта паспее, зараз кожны з вас мне і паведае, перадаючы пры гэтым - адзін край чароўнага паяска, якім звязвалі першы сноп, наступнаму ўдзельніку. Згодны? (адказваюць) Я зараз пачну гэтую цікавую гісторыю, а вы прадоўжыце. Слухайце ўважліва...

*(Праводзіцца гульня-казка* ***"Жыццё на полі каласкоў")***

Пасеелі ў полі жыта, схаваліся ў зямельку зярняткі і не відаць іх нават. Хочацца зярняткам на волю, але ж на волі яшчэ вельмі холадна і таму яны так моцна калоцяцца. Заўважыла гэта сонейка і вырашыла прыгрэць зярняткі. Неўзабаве ўзышоў першы каласок і... ..........................

*(кожны удзельнік, па чарзе прадаўжае гісторыю і перадае наступнаму край чароўнага паяска, а другі край паяска застаецца ўвесь час у руках першага ўдзельніка, такім чынам за чароўны паясок павінны трымацца ўсе удзельнікі)*

**Жнейка:** Потым сонейка яшчэ больш прыгрэла
І наша жыта хутка паспела
Ветрык колас абвяваў
І жнеяк запрашаў.

Разам клічуць каласкі: жнейкі,жнейкі прыходзіце
ў снапочак нас звяжыце.

**Жнейка:** Не чую, клічце мацней!
Зараз чуем 1іпрыйшлі, снапок звяжам - удалы...

*(Жнейка звязвае ўсіх удзельнікаў паяском)*

**Жнейка**: Вось які ў нас цудоўны сноп атрымаўся! Але не проста вам будзе з яго вызваліцца. Для гэтага вам патрэбна прадоўжыць прыказкі і прымаўкі, хто больш адгадае, той - каласок атрымае .А хто больш каласкоў атрымае, таго нейкі сюрпрыз чакае. і так слухаце ўважліва:

**1. Хто рана ўстае,------------------------таму Бог дае.**
**2. Хлеб---------------------------усяму галава.**
**3. Хто працуе,----------------------------таму і шанцуе.**
**4. Ідзеш на часок,---------бяры хлеба кусок.**
**5. Галоднай Куме,--------------------хлеб на ўме.**
**6. Без хлеба----------------няма абеда.**
**7. Каі1 хлеб у возе,--------то няма бяды ў дарозе.**
**8. Кончыў дзела,-------------------------гуляй смела.**
**(калі ад. кол.каласоў: "Без кавалка хлеба ------кепская бяседа")**

**Жнейка:** Бачу добра вы ведаеце беларускія прымаўкі і прыказкі, а таму са снапа вызваляюцца ўсе. А зараз пакажыце ў каго каласкоў больш чым у іншых? (Удзельнікі паказваюць каласкі) Вось мы і знайшлі знаўцу беларускай спадчыны. Гэта значыць, што ўсе астатнія павінны аддаць вам свае каласкі. Як бачыце, у вас атрымаўся свой сноп. А таму сёння вам належыць месца ў цэнры кола, якое ўтвораць астатнія удзельнікі. (удзельнікі ўтвараюць кола)

**Жнейка**: Вы ўсе напэўна ведаеце, што пасля, снапкі вязлі ў гумно на абмалот зярна, а ўжо далей вязлі на мельніцу, дзе зерне пераціралі жорнамі і атрымлівалася мука, з якой пяклі многа розных прысмакаў. Зараз і мы паспрабуем з вамі абмалаціць наш сноп і перацерці зерне на муку, каб потым спячы з яго смачны пернік. Для гэтага мы з вамі ўтворым жорны: пад музыку ўдзелыкі якія ўтварылі кола рухаюцца ў адзін бок, а той у каго снапок -у другі бок пры гэтым рухаючы яго ў розныя бакі - гэта значыць абмалочваць, калі музыка перастане гучаць, усе павінны спыніцца, на каго паказвае сноп, той частуеца пернікам і затым жадае ўсім прысутным што-небудзь, а потым пакідае кола.

*(Гульня прадаўжаецца да тых пор пакуль не застанецца 2 удзельніка.)*

*(Праводі1цца гульня "Жорны".)*

**Жнейка:** Ну вось усе зерне мы змалолі, а ў пякарні ўжо прысмакі гатовы. Вось вам духмяныя пернікі.

І вось цяпер паглядзім хто з вас лепшая гаспадыня.

Вам патрэбна іх прадаць , як мага хутчэй, і ў каго грошай налічыцца больш, той і пераможа. Прадаваць можна па любой цане, але час будзе абмежаваны. Усе разам лічым да двадцаці...1,2,....

*( Пад вясёлую бел. мелодыю праводзіцца гульня "Купі тавар".)*

**Жнейка**: Падлічыўшы грошы нашых гаспадынь, мы бачым хто стаў пераможцай, а таму права захоўваць сноп да наступнага года належыць вам даражэнькая... назавіце,калі-ласка сваё імя? (знаёмяцца) А вам ,паважаная ..... мы дарым гэты прыгожы вянок.

*(Пераможца атрымлівае сноп . Грошы і пернікі, як1я не паспелі прадаць застаюцца ў іх.)*

Вялікае дзякуй усім тым хто прымаў удзел у нашай праграме. Я спадзяюся, што мы хоць трошкі напомнілі вам аб рытуальных дзеяннях, якія выконваліся яшчэ нашымі продкамі для таго, каб задобрыць Багіню-Талаку на наступны год. А гэта значыць: "Пашле нам,Божа, яшчэ многа збожжа!" Я вам таксама жадаю многа шчасця, многа грошай і жыццёвай дарогі харошай! Усяго вам найлепшага!

**Праграму падрыхтавала метадыст РМЦ**
**Жанна Лупінская**

## *“АВАНГАРДЫЗМ – 2000”*

сюжэтна-гульнёвая праграма.

*На заднім плане плакат з надпісам “Авангардызм-2000”.*

**ГАННА** *(хвалюючыся,у залу):* Ой, што гэта вы тут ужо паселі, рана яшчэ. Праз 10 хвілін пачатак. (*Махнуўшы рукой.)*. Ой, ну дык ладна, сядзіце ўжо. Зараз будзем пачынаць.

*Ходзіць па зале і раздае “візіткі” на адвароце з частушкамі:*

- Ці я ў маці не дачка,
Ці я не дачушка,
Руса коса да паяса,
Чырвоная стужка.

- Нашы хлопцы - хвастуны
На сямех – адны штаны.
У сваты сабіраюцца,
За штаны ругаюцца.

- Куплю сабе чаравічкі
На разінавым хаду,
Каб не чула мая мамка,
Як з вячорачак іду.

- Я сядзела на пасцелі,
Вышывала платок белы.
Вышывала кончыкі,
Міламу паклончыкі.

- Шыла кофту, шыла кофту,
Шыла з адваротамі,
Усю ночку прасядзела
З мілым пад варотамі.

- У маёй, у родненькай,
Сарафанчык модненькі,
На падоле галуны,
Каб любілі хвастуны.

**ГАННА:** Ну вось, здаецца, усё зрабілі. Можна пачынаць.
Добры дзень вам, гледачы, хлопцы і дзяўчаты!
Запрашаем усіх сюды – к нам на наша свята!

А свята наша называецца (*паказвае на плакат*) "Авангардызм - 2000". Сёння ўсе вы зможаце не толькі паглядзець, але і паўдзельнічаць. Кожны з вас зможа, калі захоча, паказаць сваё майстэрства таленту, сваю прыгажосць, свой авангарж'дызм. Слова якое цівае – авангардызм. Ведаеце, што гэта такое? Гэта – нейкае асаблівае, індывідуальнае мастацтва. Ітак, хто самы адважны і паспрабуе першы паказаць свой авангардызм?

*З зала выходзіць дачка Алена пад песню гурта "Іван Купала" "Кастрама". Алена, апранутая, як "хіпі", размалёваная, з хусткай на галаве.*

**АЛЕНА:** Я, ма....

**ГАННА** (*спалохаўшыся*): Аленка, дачушка, што ты нарабіла?

**АЛЕНА:** Ну, ты сама говорила, чо авангардизм – индивидуальное искусство. Ну и вот. (*Паказвае на сябе.)*

**ГАННА:** І табе не сорамна?!

**АЛЕНА:** А чо? У меня свой авангардизм, у тебя свой. (*Паказвае з усмеш кай на мамін фартух.)*

**ГАННА:** Кожнаму сваё. *(Звяртаецца да залы.)*

**АЛЕНА** *(у залу):* Вот и я говорю, каждому …

**ГАННА:** Але ж каб усё гэта было больш па-людску.

**АЛЕНА:** Ма, давай не будем, народ-то смотрит. Я же первая претендентка конкурса «Авангардызм-2000», задавай мне вопросы по существу.

**ГАННА** *(рэпліка ў залу):* Дома разбяромся, (*Наіграна.)* Прабачце за непаразуменне. Ітак, на нашўай сцэне, Алена, першая ўдзельніца конкурсу. (*Злобна.*) Ну, і як называецца твой касцюм і прычоска?

**АЛЕНА:** Костюм называется «Волковысский прикид», а причёска «Росская Бандана».

**ГАННА:** А якая песня табе найбольш падабаецца?

**АЛЕНА:** «Тебе повезло, моей невесте…» группы «Мумитроль».

**ГАННА:** Дзякуй табе, Алена! (*Прыцішана.*) Ідзі да хаты, пераапраніся.

**АЛЕНА:** Ма, я тебе счас докажу, что мой стиль в моде.

**ГАННА** (*азлоблена*): Ну і як?

**АЛЕНА:** Давай я проведу небольшую викторину и ты увидишь, что вся молодёжь со мной! Е-е-ес! А ты, ма, будешь раздавать жетоны тем, кто правильно ответит. (Синего цвета.)

**ГАННА:** Ну, пачынай.

**АЛЕНА:** - Как называют девочку с белокурыми волосами? (Блондинка)

- Как называется короткая юбка? (Мини)

- Рабочая одежда в некоторых странах, а ў нас повседневная? (Джинс)

- Как называются удлинённые облегчённые шорты? (Бриджи)

- Головной убор, имеющий форму зонтика? (Шляпа)

- Какая форма современных одежд совпадает с геометрической фигурой? (Трапеция)

- Какая причёска связана с реакцией? (Химия)

- Они делают женщину стройнее и выше? (Туфли на каблуках)

- Это носят женщины, и это есть в конструкции машин. (Тормоза)

Видишь, как все всё хорошо знают. Е-е-ес!

**ГАННА:** Бачу, бачу, а ці ведаюць яны адгадкі на мае загадкі?

*Ганна загадвае загадкі,а Алена раздае жэтоны адказваючым правільна. (Красного цвета.)*

- Жыву, жыву, а ліку іх не ведаю. (Валасы)

- Чаму купляюць чобаты? (Бо дарма не даюць)

- Зверху гола, знізу лахмата, цяплом багата? (Кажух)

- Не звер, а лахматы, не конь, а з вушамі? (Шапка-вушанка)

- Бяжыць – скрыпіць, стане - маўчыць? (Боты)

- Дзявоцкі вярстак кругом рагат, у сярэдзіне пуст? (Вянок)

- Не на тое я цябе купляў, каб на цябе пазіраць, а на тое цябе браў, каб цела ў тваю дзірку сажаць. (Панчоха)

- Што кладзе мельнік на голаў, як ідзе ў млын? (Шапку)

**ГАННА:** Усё вы ведаеце! Ну, добра, хто атрымаў жэтоны сіняга цвета, падыдзіце да мяне.

**АЛЕНА:** А кто красного, ко мне. Е-е-ес! Вот и образовались у нас две команды.

**ГАННА:** І зараз мы з вамі трошкі пагуляем. І я ўсім дакажу з сваёй камандай, што наш авангард, народны, самы найлепшы. А як назавём мы нашу каманду? (*Напрыклад, полька-весялуха.)*

**АЛЕНА:** А нашу команду – «Хиппи». Согласны? Е-е-ес! Мы круче!

*Праводзіцца гульня.*

**ГАННА:** У кожнага з вас ёсць жэтоны, на якіх напісана "Авангардызм". Кожная каманда павінна асобна, напрацягу дзьвух хвілін, з гэтага слова скласці некалькі слоў і запісаць на паперку, якую праз дзве хвіліны вы перадасце мне. Аленка будзе сачыць за часам, а я трохі пагуляю з гледачамі.

Мы прыехалі з Роскага ДК. У нас ўсе вельмі добра спяваюць.
А ці спяваеце вы, зараз мы праверым.

*Хто атрымаў візіткі з частушкамі,прадстаўляецца і спявае частушку. А за гэта ўдзельнік частуецца Роскімі прысмакамі.*

*Аленка выкрэслівае аднолькавыя словы, у якой камандзе засталося больш розных слоў, тая і перамагла.*

**ГАННА:** О, якія ж вы усе разумныя!

**АЛЕНА:** Умные, да незнакомые.

**ГАННА:** Так, незнаёмыя!

**АЛЕНА:** Вот я и хочу с ними познакомиться. А заодно и доказать, что «Хиппи» - лучшая команда и по скорости, и по имени.

*Праводзіцца гульня. Насупраць кожнай каманды ставіцца крэсла. Удзельнікі кожнай каманды становяцца адзін за адным насупраць свайго крэсла. Па камандзе, кожны ўдзельнік павінен дабегчы да крэсла,надзець какошнік і фартух,што ляжаць на крэсле, потым сесці на крэсла і назваць сваё імя і прозвішча. Якая*

*каманда хутчэй пазнаёміцца,тая і лічыцца пераможцай. Крэсла павінна стаяць перадам да гледачоў. Гульня праводзіцца пад музыку.*

**ГАННА** (*звяртаецца да гледачоў*): Ці помніце, як каго называюць з той каманды, якая зараз перамагла? Калі запамятавалі, значыць трэба яшчэ раз прадставіцца.

**АЛЕНА:** Ну вот и познакаомились.

**ГАННА** (*пытаецца ў удзельнікаў,калі не ведаюць,у гледачоў*): А хто ведае з Вас, што такое "андарак"? (*Калі ніхто не ведае, дык адказвае Алена.*) (Спадніца ў палоску.)

- Ведаеце, а ці ведае хто, як на ваўкавышчыне "андарак" называецца?

**АЛЕНА:** Да я знаю. "Кишмиш". (*Принебрежительно.)*

**ГАННА:** У цябе не пытаюся, можа хто з удзельнікаў хацеў адказаць. А ты...

**АЛЕНА:** Да просто мы, авангардисты, всё знаем! Е-е-ес!

**ГАННА:** Усё?! А ведаеш, што ў цябе на галаве?

**АЛЕНА**(нашёптывает своим участникам): «Бандана», чтобы все в один голос сказали:

**ВСЕ:** «БАНДАНА»!

**ГАННА:** Не ведаю, што тут у вас за бананы на галаве, але пасапраўднаму гэта называецца так: хустка, завязана пад хіхол. Вось так, вось табе і твае Хіппі-міппі-дрыппі.

**АЛЕНА:** Ма, да какая разница, хватит базарить, давай играть.

**ГАННА:** А ты думаеш я проста так пра “кіміш” сказала? Зараз я прапаную Вам наступную гульню “Ваўкавыскі кіміш”.

*Праводзіцца гульня. Перад кожнай камандай ляжыць мяшочак, у якім схованы “кіміш” (спадніца), якая каманда назаве хутчэй усе колеры “кімішу”, тая і лічыцца пераможцай. Потым праводзіцца агульная гульня паміж камандамі. ГУЛЬНЯ: усе становяцца ў адзін круг і пад музыку перадаюць у супрацьлеглыя бакі дзве спадніцы. На ком застанецца,як змоўкне музыка,тыя павінны пратанцаваць польку.Пасля гульні,усе ўдзельнікі частуюцца ласункамі.*

**ГАННА:** Дзякуй вялікае вам за ўдзел. Бачыш, якія добрыя гульні ў нас атрымаліся з народным рэквізітам.

**АЛЕНА:** Подумаешь, я знаю такую клеевую игру, которую можно провести совсем без реквизита, только ты мне немножко поможешб.

*По жаданню можа праводзіцца,ці не “Кого ты любишь и кого поцелуешь”: Алена здымае хустку і завязвае маці вочы. Падыходзіць да каго-небудзь з гледачоў і пытаецца ў маці, каго ты любіш? Яна не бачачы, выбірае. Тады той, каго выбрала яна, падыходзіць да яе, Алена паказвае месца на тым чалавеку, і пытаецца ў маці – куды пацалуеш?*
*Небачачы, маці выбірае. Пацалаваўшы ўдзельніка гульні,*
*Ён становіцца на месца маці...*

**ГАННА:** Гульня та добрая, але ж гэта народная гульня?

**АЛЕНА:** Это народная?

**ГАННА:** А як ты думала, канешне, вось табе і авангардызм сучасны.

**АЛЕНА:** Ладно, ма, твоя взяла.

**ГАННА:** Не твоя, а наша, бо гэта не мая традыцыя, а наша – беларуская.

**АЛЕНА:** Ма, ты немножко поиграй со зрителями, а я не на долго отлучусь, хорошо?

*Алена пераапранаецца ў народны касцюм.*

**ГАННА:** А зараз мы правядзём невялікі аўкцыён. Я буду задаваць пытанні, а вы адказваць.

*Калі гледачы не адказваюць,Ганна называе сама адказ, а потым просіць гледачоў назваць падобныя прадметы дадзенаму адказу. Напрыклад, намітка, шляпа, хустка, шапка*

**ГАННА:** - Даўні галаўны ўбор замужніх жанчын на Беларусі? (Намітка.) А ў нас на Ваўкавышчыне намітка называецца «Фана».

- Гэта самаробныя, глыбокія гумовыя галошы на валенкі, буркі. (Бахілы.)

- Штаны? (Нагавіцы.)

- Каляровыя стужкі, якімі запляталі косы і ўпрыгожвалі дзявочую прычоску? (Каснікі.)

*Адказаўшыя, частуюцца ласункам. З залы выходзіць Алена ў народным касцюме, аккуратна прычэсана.*

**ГАННА:** Дачушка мая, якая ж ты прыгожая!

**АЛЕНА:** Так, мама, я зразумела, што для таго, каб крочыць з сучаснасцю, трэба ведаць і мінуўшчыну.

**ГАННА:** Так, трэба ведаць спадчыну.

**АЛЕНА:** Нашу гісторыю, таму што наша будучыня будуецца на ўсім былым

**ГАННА:** Вялікае дзякуй усім за ўвагу і ўдзел у праграме.

**АЛЕНА:** Да пабачэння!

**ГАННА:** Да новых сустрэч!

*Гучыць мелодыя «Мой родны кут» М.Багдановіча.*

Сцэнарый распрацавала метадыст РМЦ
г.Ваўкавыска **Лупінская Ж.Б.**

## «ПРАЦАВІТАЯ МАРЫЛЬКА ЗАПРАШАЕ УСІХ ГАСПАДЫНЬКАЎ»

сюжэтна – гульнёвая праграма.

*Месца правядзення: пляцоўка*
*Час правядзення: 20 хвілін*
*Аўдыторыя: моладзь*
*Мастацкае афармленне: інтэр'ер сялянскай хаты.*

*На сцэне з'яўляецца Марылька.*

**МАРЫЛЬКА:** Добры дзень, дзяўчаты і хлопцы! Прабачце, я трошкі спазнілася. Гэта я да суседачкі хадзіла, бульбу садзіла. Дык Яна мне за гэта вунь. Дзве торбы дала… А што там, і сама не бачыла. (*Заглядае ў торбы.)* Вось як добра! Дала тое, што мне якраз патрэбна: бульба, фасоля, цыбуля. Канешне, магла бы і сала палажыць, але і гэта добра! Зараз на агарод ісці, але трэба нешта есці прыгатаваць, а што мне з бульбы зрабіць такое смачнае, можа вы падкажаце, га?

*Адказы гледачоў.*

**МАРЫЛЯ:** А зараз. Хто паказаў мне, падыходзьце, калі ласка, да мяне. Ітак, мы сабралі сапрўдных аматараў беларускай бульбы. І ў нас атрымалася дзве каманды. Адну каманду мы называем "Каша", а другую – "Клецка". Згодны? (*Адказы гледачоў.)*

- А ці ўмееце вы капаць бульбу? (*Адказы каманд*.)

Зараз мы гэта праверым.

*Праводзіцца гульня "Добры ўраджай". На пляцоўцы стаяць дзве каманды з роўнай колькасцю ўдзельнікаў. Першы удзельнік бярэ бульбу з мяшка і па камандзе вядучага садзіць бульбу ў баразну і ставіцца ў канец сваёй калоны. Наступны ўдзельнік робіць тое ж самае. Калі бульба ўся пасаджана, удзельнікі збіраюць яе ў мяшок такім жа чынам як і садзілі.*

*Пераможцай становицца тая каманда якая хутчэй пасадзиць и збярэ бульбу ў мяшок.*

*Гучыць вясёлая беларуская мелодыя.*

**МАРЫЛЯ:** Віншую каманду “________” з перамогай і вялікі дзякуй удзельнікам каманды “__________”. Калі ласка, прайдзіце на свае месцы. А вы, пераможцы, затрымайцеся на некалькі хвілін. Раз вы такія спрытныя. То, напэўна, і меткія. Бульбу выкапалі, а зараз трэба яе скласці, закідаць у склеп, каб захаваць на доўгі час. Падраўняйце сваю каманду, зараз будзем пачынаць наступную гульню.

*Праводзіцца гульня “У скляпок”. Насупраць удзельнікаў гульні, стаяіць скрынка ў якую патрэбна закінуць бульбу,на адлегласці не менш 2 м, хто не трапляе, той выходзіць з гульні.*

**МАРЫЛЯ:** Тым, хто не справіўся з заданнем, закінуў толькі адну бульбу ці зусім не папаў у скрынку, вялікі дзякуй за ўдзел у гульні.

Праходзьце, калі ласка, на свае месца. А пераможцам я прапаную яшчэ адно выпрабаванне, каб вызначыць сярод вас самага працавітага.

*Праводзіцца гульня “Золушка”.*

*Удзельнікі атрымліваюць посуд з гарохам і фасоллю. Па камандзе, удзельнікі выбіраюць фасолю. Хто хутчэй справіцца з заданнем, той і пераможца.*

**МАРЫЛЯ:** Вось і настаў момант пазнаёміцца з нашымі ўдзельнікамі. Назавіце, калі ласка, сваё імя.

*Адказы ўдзельнікаў.*

**МАРЫЛЯ:** “_________”, “__________” мы кажам дзякуй за ўдзел у гульні, праходзьце, калі ласка, на сваё месца. А пераможца “________”, мы віншуем вас з перамогай. Уручаем вам прыз і апладысменты нашых гледачоў. Праходзьце ў залу.

Вялікі дзякуй, што дапамаглі. Цяпер я ведаю, што прыгатаваць, пайду кухарыць.

А я развітваюцся з вамі, Усяго вам добрага! Да новых сустрэч!

*Гучыць музыка.*

Сцэнарый распрацавала метадыст РМЦ
г.Ваўкавыска **Лупінская Ж.Б.**